# Трыццаць — "Ветразю..."

**26 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбылася сустрэча ўдзельнікаў будаўнічага атрада "Ветразь надзеі", які быў арганізаваны трыццаць гадоў таму — у 1981-м.**





Удзельнікі будатрадаў трыццаць гадоў таму і сёння.

Фота Пятра ОВАДА

Будатрад тагачаснага Мінскага інстытута культуры славіўся як адзін з найлепшых у БССР. Сведчаннем таму — шматлікія ганаровыя граматы, падзякі ды іншыя ўзнагароды, прычым некаторыя з іх дайшлі да сваіх уладальнікаў толькі цяпер. Будынкі, узведзеныя рукамі беларускіх студэнтаў, стаяць у Карэліі, Цюменскай вобласці, розных кутках Сібіры.

Удзельнікаў будатрада сустрэў рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў. Ён распавёў пра сённяшні стан універсітэта, пра міжнародныя кантакты навучальнай установы (у тым ліку — з Цюменскай акадэміяй мастацтва, культуры і сацыяльных камунікацый, дзе навучаецца даволі шмат беларусаў Сібіры). Рэктар казаў і пра тое, што дзверы ўніверсітэта заўсёды адкрыты для колішніх выпускнікоў, і запрасіў іх да актыўнага супрацоўніцтва.

Пасля прывітальнай часткі сустрэчы для ўдзельнікаў будатрада песні савецкіх гадоў выканалі першакурсніцы БДУКіМ. Апошнюю ж ноту ў сустрэчы паставіў удзельнік будатрада, саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Васіль Мінгалёў, які выканаў творы з сусветнай рамансавай класікі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ